УДК 94(476) «1864/1917»

***Ляпешкін Я. М.***
Навуковы кіраўнік – доктар гістарычных навук,
прафесар Лукашэвіч А. М.

# АНАЛІЗ СКЛАДУ МАГІЛЁЎСКІХ ГУБЕРНАТАРАЎ (1864–1917 гг.)

У дакладзе прааналізаваны колькасныя і якасныя характарыстыкі магілёўскіх губернатараў, выяўлены ўзровень адукацыі, паходжанне, сярэднія велічыні ўзросту, працягласці кіравання. Вызначаны чыны, класы, якія мелі чыноўнікі да і пасля магілёўскага губернатарства, прасочваецца іх кар'ера.

*Ключавыя словы:* магілёўскія губернатары, Магілёўская губерня, чыноўнікі.

В докладе проанализированы количественные и качественные характеристики могилёвских губернаторов, выявлен уровень их образования, происхождение, средний возраст, продолжительность управления. Определены чины, классы, которые имели чиновники до и после губернаторства, прослежена их карьера.

*Ключевые слова:* могилёвские губернаторы, Могилёвская губерния, чиновники.

The report analyzes the quantitative and qualitative characteristics Mahilyou governors detected level of education, origin, age averages, the control duration. The tasks, classes that had officials before and after the Mogilev Governorate, traced their careers.

*Keywords:* Mogilev governor, Mogilev province, officials.

Губернатары былі вышэйшымі прадстаўнікамі мясцовых органаў дзяржаўнай улады. Яны рэалізоўвалі палітыку цэнтра на месцах і неслі за яе ажыццяўленне персанальную адказнасць. Даследаванне гэтай катэгорыі чыноўнікаў уяўляецца актуальным, бо дазваляе прасачыць ад каго залежылі галоўныя кірункі грамадска-палітычнага і сацыяльна-эканамічнага развіцця ў губернях.

Ахопліваецца перыяд з 1864 г., калі ўсе ваенныя і грамадзянскія начальнікі асобных губерняў сталі называцца губернатарамі. Гэта было замацавана ўказам ад 31 жніўня 1864 г., "Аб вызваленні ваенных губернатараў ад загадвання ваеннай часткай", які прысвойваў усім начальнікам губерняў агульны тытул – "Губернатар" [9, с. 867].

Калі дзень і месяц нараджэння губернатара невядомы, то ў якасці такіх дадзеных выкарыстоўвалася дата 1 студзеня [4, с. 12]. Напрыклад, чыноўнік нарадзіўся ў 1819 г. значыць з 1 студзеня 1870 г. яго ўзрост вызначаецца ў 51 г. Праўленне губернатара лічылася з часу выканання пасады (в. п.), або прызначэння на яе. На паходжанне ўказвала інфармацыя пра ўнясенне ў радавую кнігу, пра радавы маёнтак і інш. У выпадку атрымання некалькіх адукацый – улічвалася вышэйшага ўзроўня. Ваенныя і грамадзянскія чыны адпавядалі класным чынам згодна Табеля аб рангах [5, с. 137–143].

Усяго па Магілёўскай губерні за перыяд 1864–1917 гг. службу прайшло 12 губернатараў. Сярэдні ўзрост магілёўскіх губернатараў на момант прызначэння на пасаду (в. п.) складаў 44,8 г. Сярэдняя працягласць тэрміна знаходжання на пасадзе магілёўскага губернатара складала 4,9 года. (Гл. табл. 1).

У залежнасці ад узроста губернатараў іх можна размеркаваць на тры групы. Так, 3 губернатары трапляюць ва ўзроставую катэгорыю да 40 г., 6 асоб знаходзіцца ў дыяпазоне ад 40 да 49 гг. і 3 – у інтэрвале 50–59 гг.

Сацыяльна-канфесійнае і геаграфічнае паходжанне выглядае наступным чынам. Усе магілёўскія губернатары належылі да дваран. 5 асоб паходзіла з велікарускіх губерняў, 4 – з украінскіх, 1 – з прыбалтыйскіх, 1 – з беларускіх, 1 – невядома. Па веравызнанні 11 асоб прытрымліваліся праваслаўя, 1 быў евангеліст-рэфарматар (гл. табл. 1).

*Табліца* 1

**Узрост, тэрмін знаходжання на пасадзе, в. п., паходжанне і веравызнанне магілёўскіх губернатараў (1864–1917 гг.)**
[1, с. 270, 274, 281; 3, с. 13; 6, 277-278; 7, с. 769-771, 773-774, 776-779, 781, 783-784; 8, с. 205, 268; 10, с. 83, 92, 94, 98, 100; 11, с. 45; 12, с. 15-17, 28-29, 165-166; 14, с. 302; 15, с. 328-329; 16, с. 170, 173].

| № | Ініцыялы, прозвішча | Узрост прызначэння на пасаду губернатара, в. п. (гады) | Тэрмін знаходжання на пасадзе губернатара, в. п. | | | Паходжанне | | Веравызнанне |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | Гады | Месяцы | Дні | Сацыяльнае | Геаграфічнае (губерня) | |
| 1. | А. П. Беклемішаў | 33 | 10 | 5 | 20 | З дваран | Ніжагародская | Праваслаўны |
| 2. | П. Н. Шалгуноў | 42 | 2 | 4 | 23 | | Пскоўская | |
| 3. | В. Д. Дунін-Баркоўскі | 51 | 1 | 5 | 14 | | Чарнігаўская | |
| 4. | А. С. Дамбавецкі | 32 | 21 | 5 | 0 | | Валынская | |
| 5. | Д. М. Мартынаў | 42 | 0 | 3 | 23 | | Кіеўская | |
| 6. | М. А. Зіноўеў | 54 | 7 | 1 | 15 | | Яраслаўская | |
| 7. | М. К. Сямякін | 54 | 1 | 3 | 8 | | Херсонская | |
| 8. | М. М. Клінгенберг | 49 | 3 | 5 | 7 | | – | |
| 9. | Д. Ф. Гагман | 44 | 2 | 8 | 23 | | Цвярская | |
| 10. | К. С. Нолькен | 49 | 1 | 5 | 29 | | Магілёўская | Евангеліст-рэфарматар |
| 11. | А. І. Пільц | 39 | 5 | 10 | 29 | | Санкт-Пецярбургская | Праваслаўны |
| 12. | Д. Г. Яўленскі | 49 | 1 | 1 | 18 | | Яраслаўская | |
| Разам | | 44,8 | 4,5 | 4,6 | 17,4 | | | |



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Усе магілёўскія губернатары скончылі спецыяльныя навучальныя ўстановы. 2 асобы атрымалі вышэйшую ваенную адукацыю, 4 – вышэйшую свецкую, 4 – сярэднюю ваенную, 3 – сярэднюю свецкую. Прычым адзін з пералічаных меў вышэйшую адукацыю ваеннага і свецкага накірункаў (гл. табл. 2).

*Табліца* 2

**Адукацыя магілёўскіх губернатараў (1864–1917 гг.)**
[1, с. 270, 274; 6, с. 277; 10, с. 83, 87, 92, 94, 100; 12, с. 25, 166; 15, с. 328; 11, с. 45; 16, с. 170]

| № | Ініцыялы, прозвішча | Адукацыя | Вышэйшая | | Сярэдняя | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | Ваенная | Свецкая | Ваенная | Свецкая |
| 1. | А. П. Беклемішаў | Імператарскі Царскасельскі ліцэй | | | | + |
| 2. | П. Н. Шалгуноў | Полацкі кадэцкі корпус | | | + | |
| 3. | В. Д. Дунін-Баркоўскі | Імператарскі Царскасельскі ліцэй | | | | + |
| 4. | А. С. Дамбавецкі | Кіеўскі ўніверсітэт, гісторыка-філалагічны фак-т | | + | | |
| 5. | Д. М. Мартынаў | Маскоўскі ўніверсітэт, юрыдычны фак-т, Ваенна-юрыдычная акадэмія | + | + | | |
| 6. | М. А. Зіноўеў | Лазараўскі інстытут усходніх моў, Канстанцінаўскі межавы інстытут | | + | | |
| 7. | М. К. Сямякін | Пажскі корпус | | | + | |
| 8. | М. М. Клінгенберг | Санкт-Пецярбургскі ўніверсітэт, юрыдычны фак-т | | + | | |
| 9. | Д. Ф. Гагман | 1-е ваеннае Паўлаўскае вучылішча | | | + | |
| 10. | К. С. Нолькен | Мікалаеўская акадэмія Генеральнага штаба | + | | | |
| 11. | А. І. Пільц | Імператарскае вучылішча правазнаўства | | | | + |
| 12. | Д. Г. Яўленскі | 2-е Канстанцінаўскае вучылішча | | | + | |
| | Разам | | 2 | 4 | 4 | 3 |

Тытулаваным з'яўляўся толькі адзін губернатар. Напярэдадні прызначэння на пасаду магілёўскім губернатарам усе кандыдаты мелі чын па грамадзянскаму ведамству не ніжэй калежскага саветніка альбо – па ваеннаму ведамству не ніжэй генерал-маёра. Так, 1 асоба з'яўлялася калежскім саветнікам, 2 – стацкімі саветнікамі, 5 – сапраўднымі стацкімі саветнікамі, 3 – генерал-маёрамі, 1 – тайным саветнікам. 1 чалавек меў чын VI класа, 2 – V класа, 8 – IV класа, 1 – III класа. Пасля звальнення становішча выглядае наступным чынам. 1 асоба стала стацкім саветнікам, 4 былі сапраўднымі стацкімі саветнікамі, 3 – генерал-маёрамі, 4 –тайнымі саветнікамі. 1 чалавек меў чын V класа, 7 – IV класа, 4 – III класа (гл. табл. 3).

Пра паспяховасць чыноўнікаў сведчаць іх найвышэйшыя чыны. Так, сярод тых, хто прайшоў магілёўскае губернатарства, 1 асоба стала сапраўдным тайным саветнікам, 5 – мелі чын тайнага саветніка, 3 – сапраўднага стацкага саветніка, 3 – генерал-маёра. Найвышэйшыя класныя чыны наступныя: 1 асоба атрымала чын II класа, 5 чалавек былі ў чыне III класа, 6 – IV класа (гл. табл. 3).

*Табліца* 3

**Тытулы, чыны, класы магілёўскіх губернатараў (1864–1917 гг.)**
[1, с. 270, 274; 6, с. 277-278; 7, с. 777, 779-783; 8, с. 205; 10, с. 92, 94; 12, с. 104, 129, 177, 180; 13, с. 249, 258; 14, с. 302, 392; 15, с. 329, 330; 16, с. 170-171].

| № | Ініцыялы, прозвішча | Тытул | Чын | Клас | Чын | Клас | Найвышэйшы | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | пры прызначэнні на пасаду губернатарам, дата | | пры звальненні з пасады губернатара, дата | | Чын, дата | клас |
| 1. | А.П. Беклемішаў | – | СС | V | 31.12.1858 – ССС | IV | 22.09.1868 – ТС | III |
| 2. | П.Н. Шалгуноў | – | 14.07.1864 – Г-м | IV | Г-м | IV | Г-м | IV |
| 3. | В.Д. Дунін-Баркоўскі | – | 29.07.1860 – ССС | IV | 28.03.1871 – ТС | III | ТС | III |
| 4. | А.С. Дамбавецкі | – | 30.03.1872 – ССС | IV | 20.08.1882 – ТС | III | ТС | III |
| 5. | Д.М. Мартынаў | – | 30.08.1893 – ССС | IV | ССС | IV | 06.12.1903 – ТС | III |
| 6. | М.А. Зіноўеў | – | 30.08.1889 – ТС | III | ТС | III | І4.06.1906 – СТС | II |
| 7. | М.К. Сямякін | – | 09.04.1896 – Г-м | IV | Г-м | IV | Г-м | IV |
| 8. | М.М. Клінгенберг | – | 30.08.1891 – ССС | IV | 28.03. 1904 – ТС | III | ТС | III |
| 9. | Д.Ф. Гагман | – | 1905 – КС | VI | 1907 – СС | V | 08.02.1912 – ССС | IV |
| 10. | К.С. Нолькен | Барон | 06.12.1907 – Г-м | IV | Г-м | IV | Г-м | IV |
| 11. | А.І. Пільц | – | 14.05.1908 – СС | V | 30.08.1911 – ССС | IV | ССС | IV |
| 12. | Д.Г. Яўленскі | – | 01.01.1910 – ССС | IV | ССС | IV | ССС | IV |
| Разам | | 1 | КС – 1<br>СС – 2<br>ССС– 5<br>Г-м – 3<br>ТС – 1 | VI – 1<br>V – 2<br>IV – 8<br>III – 1 | СС – 1<br>ССС – 4<br>Г-м – 3<br>ТС – 4 | V – 1<br>IV – 7<br>III – 4 | СТС – 1<br>ТС – 5<br>ССС – 3<br>Г-м – 3 | II –1<br>III – 5<br>IV – 6 |

Умоўныя скарачэнні: КС – Калежскі саветнік, СС – Стацкі саветнік, ССС – Сапраўдны стацкі саветнік, ТС – Тайны саветнік, Г-м – Генерал-маёр, СТС – Сапраўдны тайны саветнік.

Таксама можна даведацца пра тое, як складвалася кар'ера чыноўнікаў, якія служылі магілёўскімі губернатарамі. Напярэдадні службы магілёўскім губератарам 7 асоб займалі такую ж пасаду ў іншых губернях. 2 чыноўніка служылі віцэ-губернатарамі, 1 асоба – начальнікам упраўлення земляробства і дзяржаўных маёмасцяў, 1 – старшынёй павятовай земскай управы, 1 – сакратаром 5-га класа пры галоўным начальніку 3-га аддзялення Уласнай Яго Імператарскай Вялікасці канцылярыі. Пры гэтым 3 чыноўніка працавалі ў беларускіх губернях. Увогуле да прызначэння на пасаду магілёўскім губернатарам 6 асоб прайшлі грамадзянскую службу і 6 – ваенную і грамадзянскую. Пасля губернатарства ў Магілёве 9 асоб працягнулі службу, застаўшыся на грамадзянскай ніве. Праўда, адзін быў яшчэ і ваенным генерал-губернатарам.

У кар'еры 6 магілёўскіх губернатараў пасада начальніка губерні засталася найвышэйшай. 2 асобы сталі таварышамі міністэрства ўнутраных спраў, 1 – членам Савета міністра ўнутраных спраў, 3 – сенатарамі (гл. табл. 4).

*Табліца* 4

**Кар'ера магілёўскіх губернатараў (1864–1917 гг.)**
[1, с. 270, 274; 2, с. 125, 538; 6, с. 277-278; 7, с. 780-783; 10, с. 83, 89, 92, 94, 98, 100; 12, с. 131; 15, с. 328-330; 16, с. 171]

| № | Ініцыялы, прозвішча | Пасада напярэдадні прызначэння магілёўскім губернатарам | Вышэйшая пасада | Служба | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | Папярэдняя | | Наступная | |
| | | | | Ваенная | Грамадзянская | Ваенная | Грамадзянская |
| 1. | А.П. Беклемішаў | Курляндскі віцэ-губернатар | Член Савета міністра ўнутраных спраў | | + | | + |
| 2. | П.Н. Шалгуноў | Мінскі губернатар | Губернатар | + | + | | + |
| 3. | В.Д. Дунін-Баркоўскі | Екацерынаслаўскі губернатар | Губернатар | | + | | + |



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*Заканчэнне табліцы 4*

| № | Ініцыялы, прозвішча | Пасада напярэдадні прызначэння магілёўскім губернатарам | Вышэйшая пасада | Служба | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | Папярэдняя | | Наступная | |
| | | | | Ваенная | Грамадзянская | Ваенная | Грамадзянская |
| 4. | А.С. Дамбавецкі | Сакратар 5-га класа пры галоўным начальніку 3-га аддзялення Уласнай Яго Імператарскай Вялікасці канцылярыі | Сенатар | | + | | + |
| 5. | Д.М. Мартынаў | Магілёўскі віцэ-губернатар | Сенатар | + | + | | + |
| 6. | М.А. Зіноўеў | Тульскі губернатар | Дырэктар гаспадарчага дэпартамента МУС, таварыш міністэрства ўнутраных спраў | | + | | + |
| 7. | М.К. Сямякін | Падольскі губернатар | Губернатар | + | + | Памёр | |
| 8. | М.М. Клінгенберг | Уладзімірскі губернатар | Сенатар | | + | | + |
| 9. | Д.Ф. Гагман | Старшыня Віцебскай павятовай земскай управы | Губернатар | + | + | | + |
| 10. | К.С. Нолькен | Томскі губернатар | Губернатар | + | + | Выйшаў у адстаўку | |
| 11. | А.І. Пільц | Начальнік упраўлення земляробства і дзяржаўных маёмасцяў у Туркестанскім краі. | Таварыш міністэрства ўнутраных спраў, іркуцкі ваенны генерал-губернатар. | | + | + | + |
| 12. | Д.Г. Яўленскі | Пскоўскі губернатар | Губернатар | + | + | Звольнены па хваробе | |
| | Разам | | | 6 | 12 | 1 | 9 |

Такім чынам, аналіз складу магілёўскіх губернатараў за 1864–1917 гг. паказаў, што на гэтым пасту прайшло службу 12 асоб. Іх сярэдні ўзрост на момант прызначэння на пасаду (в. п.) складаў 44,8 г., а сярэдняя працягласць тэрміна знаходжання на пасадзе начальніка Магілёўскай губерні – 4,9 г. Усе яны належылі да дваран. Большасць губернатараў паходзіла з велікарускіх і ўкраінскіх губерняў. Па веравызнанні 11 асоб прытрымліваліся праваслаўя і толькі адзін быў евангеліст-рэфарматар. 6 асоб мелі вышэйшую ці сярэднюю ваенную адукацыю, 7 – свецкую. Да прызначэння на пасаду магілёўскім губернатарам усе валодалі вопытам грамадзянскай службы, а 6 – яшчэ і ваеннай. Пры звальненні з пасады магілёўскага губернатара ўсе, за выключэннем аднаго, мелі чын не ніжэй сапраўднага стацкага саветніка.

**Літаратура:**


1. Беларусь в годы Первой мировой войны (1914–1918): сб. документов / сост. В. В. Врублевский [и др.]; редкол.: В. И. Адамушко [и др.]. – Минск : Беларусь, 2014. – 356 с.
2. Биографический словарь. Высшие чины Российской Империи (22.10.1721–2.03.1917). Т. 1: А–З. / Сост. Е. Л. Потемкин. – Москва : Б. и., 2017. – 623 с.
3. Деятели революционного движения в России: от предшественников декабристов до падения царизма: биобиблиографический словарь / Всесоюзное о-во политических каторжан и ссыльно-поселенцев; под ред. Феликса Кона [и др.]. – Москва: Изд-во Всесоюзного о-ва политических каторжан и ссыльно-поселенцев, 1927–1933. – Т. 1, ч. 1: От предшественников декабристов до конца «Народной воли». ч. 1. До 50-х гг. XIX в. / сост. А. А. Шиловым и М. Г. Карнауховой. – 1927. – XXVIII, [6] с., 222 стб.: портр.
4. Зайончковский, П. А. Правительственный аппарат самодержавной России в XIX в. / Зайончковский, П. А. – Москва : Мысль, 1978. – 288 с.
5. Лукашевич, А.М. Институт губернаторства в Беларуси 1772–1917 гг. [Электронный ресурс]: электронный учебно-методический комплекс для специальностей: 1–21 03 01–01 «История (отечественная и всеобщая)» / А. М. Лукашевич; БГУ, Исторический фак., Каф. истории Беларуси нового и новейшего времени. – Электрон. текстовые дан. – Минск: БГУ, 2017. – 175 с.: табл. – Библиогр.: с. 167–173. – Режим доступа: http://elib.bsu.by/handle/123456789/183970 – Дата доступа: 02.04.2018.
6. Минские губернаторы, вице-губернаторы и губернские предводители дворянства (1793–1917): биографический справочник / сост. Ю. Н. Снапковский; редкол.: В. И. Адамушко [и др.]. – Минск : Беларусь, 2016. – 398 с., [2] л.: ил.
7. Могилевская губерния: государственные, религиозные и общественные учреждения (1772–1917) / Е. К. Анищенко [и др.] – Минск : Беларусь, 2014. – 814 с., [12] л. ил.
8. Мурзанов, Н. А. Словарь русских сенаторов, 1711–1917 гг.: материалы для биографий / Н. А. Мурзанов. – Санкт-Петербург: Дмитрий Буланин, 2011. – 735 с., [17] л. ил., портр.
9. Об освобождении военных губернаторов от заведывания военною частию, и о переименовании и правах начальников губерний: именной указ Сенату, 31 авг. 1864 г., № 41241 // ПСЗРИ. Собр. 2: в 55 т. – СПб., 1867. – Т. 39 : Отд. 1. – С. 867.
10. Памятная книжка Могилевской губернии на 1910 год. – Могилев: Могилевск. губ. стат. ком., – 1910. – XLIII, 455, XXXVIII, 86, 73, [13] с., [15] л. портр.
11. Правительствующий сенат: [Краткий исторический очерк и биографии сенаторов]. – СПб.: типо-лит. С.-Петерб. одиночной тюрьмы, 1912. – [16], 83, 172 с. с ил.; 6 л. ил.
12. Сидоренко, Б. И. Могилевский губернатор Александр Станиславович Дембовецкий и его время / Б. И. Сидоренко. – Могилев: АмелияПринт, 2012. – 250 с.
13. Список гражданским чинам первых трех классов. Исправлен по 1 сентября 1914 года. – Петроград: Сенатская типография, 1914. – 726 с.
14. Список гражданским чинам первых трех классов. Исправлен по 15-е октября 1876 года. – СПб.: Типография Правительствующего сената, 1876. – 625 с., 14 с.
15. Шилов, Д. Н. Члены Государственного совета Российской империи, 1801–1906 гг.: биобиблиографический справочник / Д. Н. Шилов, Ю. А. Кузьмин. – Санкт-Петербург: Дмитрий Буланин, 2007. – 992, [1] с.
16. Яковенко, А. В. Томские губернаторы: биобиблиографический указатель / А. В. Яковенко, В. Д. Гахов. – Томск: Ветер, 2012. – 223 с.: ил., портр.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова